**УДК 811.161.3'42:821.161.3-1*А. Куляшоў**

***В. В. Кашэвіч***

# ВОБРАЗНА-ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ СРОДКІ Ў МОВЕ ДАВАЕННЫХ ПАЭМ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

*Артыкул прысвечаны разгляду стылістычных асаблівасцей вобразна-выяўленчых сродкаў у мове паэм Аркадзя Куляшова «Баранаў Васіль» і «У зялёнай дуброве». У паэмах часта сустракаюцца эпітэты, выражаныя прыметнікамі. Увасабленні дапамагаюць аўтару больш назіральна перадаць апісаныя рэаліі. Параўнанні выяўляюць схаваныя якасці рэалій праз супастаўленне з іншымі рэаліямі. Паказаныя моўныя сродкі павышаюць эмацыянальнасць і выразнасць мовы твораў.*

Сродкі маўленчай выразнасці надаюць мастацкаму маўленню яркасць, узмацняюць яго эмацыйнае ўздзеянне, акцэнтуюць увагу чытача і слухача да выказвання. У мастацкай мове асобую ролю адыгрываюць тропы – звароты мовы ў пераносным значэнні. Сродкі мастацкай выразнасці дапамагаюць аўтару стварыць мастацкі вобраз, а чытачу – увайсці ў свет мастацкага твора, раскрыць аўтарскую задуму.

У мове даваенных паэм Аркадзя Куляшова («Баранаў Васіль», «У зялёнай дуброве») вылучаюцца адметныя вобразна-выяўленчыя сродкі, якія ствараюць вобразнасць мовы і робяць яе выразнай.

А. Куляшоў у мове указаных паэм выкарыстаў значную колькасць разнастайных эпітэтаў. Эпітэт – гэта азначэнне пры слове, якое выказвае аўтарскае ўспрыманне, а таксама дадае да назвы прадмета больш выяўленчасці [1, с. 46].

З дапамогай эпітэтаў аўтар выказвае свае адносіны да людзей, якія з’яўляюцца ворагамі галоўнага героя:

*Сягоння ж чакала нядарам* ***Няўдалых*** *налётчыкаў зноў* [2, с. 123].

Цікавы эпітэт у радках:

*З* ***драпежнаю*** *мэтай і прагай Крадком прапоўзшы кардон* [2, с. 123].

Тут эпітэт паказвае адносіны аўтара да аднаго з герояў паэмы Васіля. Слова *драпежны* ў дадзеным выпадку перадае, што хлопец нічога не баяўся дзеля выратавання сваіх сяброў, сваёй Радзімы. Умацоўваецца ўражанне ад папярэдняга эпітэта з дапамогай наступнага:

*З* ***бяспрыкладнай*** *лезе адвагай На сорак байцоў батальён* [2, с. 123].

Прыметнік *бяспрыкладны* паказвае, што Васіль быў вельмі смелым хлопцам. Больш за тое, лексема *бяспрыкладны* падкрэслівае, што няма роўных гэтаму чалавеку. З дапамогай эпітэта А. Куляшоў называе якасці характару і асаблівасці паводзін героя.

Эпітэтамі ў паэмах абазначаны стан прыроды:

***Суровыя*** *выюць мяцелі, Далёкая плача зямля* [2, с. 124].

Праз спалучэнне *суровыя мяцелі* аўтар паказвае настрой наваколля, што быццам перажывае складаную сітуацыю разам з героям твора.

Эпітэты-прыметнікі дазваляюць аўтару яскрава паказаць адносіны паміж героямі твора: *З* ***ласкавым*** *дакорам Завуць яны хорам* [3, с. 8]. Аўтар тут дапускае намёк на адносіны Васіля да Хрысціны, на вяселле якой ён не хоча ехаць: ***Прыгожы*** *ж ён дужа, Сама б пакахала* [3, с. 9].

Аўтар паказвае чытачам настрой сяброўак Хрысціны перад вяселлем. Яны жартуюць і сярод гэтых жартаў гавораць аб тым, як успрымаюць мужа Хрысціны. Гэта не толькі дазваляе намаляваць партрэт Івана, але таксама адлюстроўвае некаторыя рысы характару дзяўчат: весялосць, жартаўлівасць, натуральнасць. Працягваецца гэтае адлюстраванне далей: ***Харошага*** *мужа Хрысціны прыдбала* [3, с. 9]. тут няма акцэнту на знешнасці Івана, а персанаж характарызуецца ў цэлым.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Эпітэты ў паэмах А. Куляшова «Баранаў Васіль», «У зялёнай дуброве» ў асноўным выражаюцца прыметнікамі і паказваюць адносіны аўтара да герояў твора, узмацняюць выразнасць паэмы.

Цікавасць выклікае актыўнае выкарыстанне А. Куляшовым такога стылістычнага прыёму, як увасабленне. Увасабленне – гэта надзяленне неадушаўлёных прадметаў прыкметамі і ўласцівасцямі чалавека [1, с. 21].

Перш за ўсё разгледзім выпадкі ўвасаблення ў паэме «Баранаў Васіль».

А. Куляшоў апісвае ў паэме Радзіму так, што яна ўяўляецца нам жывой асобай: *І цёплую шубу на плечы* ***Надзела Радзіма*** *яму* [2, с. 122]. Праз выраз *надзела шубу* пісьменнік выразна паказвае ролю Радзімы ў жыцці чалавека, акцэнтуе ўвагу на галоўнай тэме твора.

Наступны выпадак увасаблення у паэме:

***Аслеплі маньчжурскія зоры****, І нанач зацьмілася сінь* [2, с. 122].

Дзеяслоў *аслепнуць* па большай частцы выкарыстоўваецца ў адносінах да жывых істот, бо менавіта яны валодаюць такім пачуццём ўспрымання, як зрок. У канкрэтным выпадку дзеяслоў ўжываецца ў адносінах да нябесных свяцілаў. Надзяляючы прыродныя з’явы якасцямі жывых істот, калі прырода перажывае падзеі разам з персанажамі паэмы, аўтар ўзмацняе эмацыянальнасць тэксту.

Увасабленне ўзмацняе выразнасць іншых радкоў:

*Адгэтуль далёка да дому... Там* ***спіць*** *пад ільдамі* ***рака*** [2, с. 124].

У беларускай моўнай культуры дзеяслоў *спаць* пераважна выкарыстоўваецца ў адносінах да жывых істот, бо менавіта ім неабходны сон для аднаўлення фізічных сіл. Тут жа *спіць рака* – гэтым аўтар паказвае, што дзесьці далёка ў сапраўдны момант усё ціха і спакойна, у той час як герой перажывае не лепшыя часы.

Таксама можна знайсці некаторыя выпадкі ўвасаблення ў творы «У зялёнай дуброве»: ***Вазкі на рысорах Ныраюць*** *за узгоркі* [3, с. 5]. Дзеяслоў *ныраць* спалучаецца у сваім асноўным значэнні з назвамі адушаўлёных прадметаў, бо абазначае адпаведны від дзейнасці. Калі ж ён выкарыстоўваецца ў адносінах да прадметаў неадушаўлёных, то гэта дазваляе адлюстраваць больш яскрава неабходныя аўтару для лепшага ўспрымання аповеду абставіны.

Аўтар звяртаецца да прыёму увасаблення, калі кажа пра тое, як едуць работнікі калгаса: ***Ляціць на іх*** *блізкая* ***Ростань-дуброва*** [3, с. 9]. Героі праязджаюць знаёмыя месцы, Хрысціна аддаецца ўспамінам. Увасабленне ўзмацняе вобразнасць дзеяння, паскарае ход падзей.

Іншы раз паэт звяртаецца да папулярнага ў літаратуры і ў фальклоры ўвасаблення: *Над імі* ***дуброва Гамоніць*** *сардэчна* [3, с. 10]. У выніку – персанажы набліжаюцца да самой прыроды, памяншаецца дыстанцыя паміж людзьмі і прыродай, а таксама ствараецца асаблівa экспрэсіўны вобраз дубровы.

Такім чынам, у мове даваенных паэм А. Куляшова прыём увасаблення выкарыстоўваецца досыць актыўна і спрыяе павышэнню вобразнасці і эмацыянальнасці радкоў.

Аўтар шырока выкарыстоўвае ў сваіх даваенных паэмах параўнанне. Параўнанне – гэта прыпадабненне аднаго прадмета да другога на аснове іх агульнай прыметы з мэтай узмацнення выразнасці яго характарыстыкі. Параўнанні з’яўляюцца адным з самых з пашыраных сродкаў маўленчай канкрэтызацыі, якія выдзяляюць, падкрэсліваюць і пастаянныя, устойлівыя, істотныя прыкметы прадметаў, і іх часовыя, неістотныя адзнакі.

У мове разгледжаных твораў параўнанні надзвычай разнастайныя як па семантыцы, так і па структуры. Супастаўленне прадметаў або з’яў у параўнанні можа быць станоўчым або адмоўным, калі пэўная якасць ці адзнака падкрэсліваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адмаўленнем станоўчага сцверджання. Мастацкі вобраз, дзякуючы такому параўнанню набывае незвычайную эмацыянальную сілу і выразнасць.

У параўнанні ўзаемадзейнічаюць абедзве часткі супастаўлення – і тое, што параўноўваецца, і тое, з чым параўноўваецца. Граматычна параўнанні афармляюцца па-рознаму, найчасцей выражаюцца з дапамогай злучнікаў і злучальных слоў. Параўнанне дапамагае зрабіць паэтычны малюнак яскравым, наглядным, жывапісным і даць яму пэўную ацэнку.

Параўнанні ўяўляюць сабой важны мастацкі сродак паэм А. Куляшова, бо менавіта на іх аснове складаюцца вобразы, аб'ёмныя вербальныя малюнкі, панарамныя карціны, у якіх адлюстроўваюцца тыя ці іншыя рэаліі, убачаныя вачыма канкрэтнага аўтара. Параўнанні выкарыстоўваюцца найперш для таго, каб у вядомых, звычайных рэчах, падзеях, прыметах, дзеяннях выявіць іх утоеныя якасці, што выдзяляюцца мастаком слова праз супастаўленне з іншымі рэаліямі, дзе гэтыя якасці з'яўляюцца відавочнымі, кідкімі, дамінантнымі.

Параўнанні ў мове даследаваных твораў надзвычай разнастайныя па структуры і сродках сувязі:

– простыя параўнанні: *Кароткі, халодны,* ***як жаба*** [2, с. 125 ];

– параўнанні-словазлучэнні:

***Як лёгкія птушкі****, Паселі ў машыну З нявестай падружкі* [3, с. 10 ];

***Як люднага свята****, Чакаюць уборкі* [3, с. 122];

– разгорнутыя параўнанні:

*Праз месяц іх вёска Звінела ладамі,*

***Як ехаў у войска Васіль з дружбакамі*** [3, с. 121].

У даваенных паэмах Аркадзя Куляшова сустракаюцца часцей злучнікавыя параўнанні, у якіх сродкам сувязі аб'екта і суб'екта параўнання выступаюць розныя злучнікі. У мове паэм можна сустрэць параўнанні са злучнікам *нібыта*:

*Існіў ён сяброў па заставе,* ***Нібыта****, як некалі,*

*Зноў, Ён з імі ляжыць ў атаве* [2, с. 130].

Але самы распаўсюджаны сродак сувязі ў параўнаннях, адзначаных у мове паэм А. Куляшова «Баранаў Васіль», «У зялёнай дуброве» – гэта злучнік *як*:

*І хутка,* ***як*** *роднага, прымуць Яго на заставе байцы* [2, с. 120 ];

*Пад сэрца вялікага ўдары Васіль засынаў,* ***як*** *дзіця* [2, с. 119].

У аснове параўнання ляжыць супастаўленне прадметаў, з'яў з іншымі прадметамі, з'явамі дзеля дасягнення большай яркасці адлюстравання іх, большай нагляднасці ўяўлення, што ўзнікае ў чытача. Праз параўнанні выражаюцца таксама адносіны аўтара да апісанай рэчаіснасці, дасягаецца большая лагічная дакладнасць.

Такім чынам, мова даваенных паэм Аркадзя Куляшова насычана рознымі вобразна-выяўленчымі сродкамі. Гэта дазваляе глыбока рэалізаваць аўтарскую задуму, надаць твору вобразнасць, эмацыянальнасць і выразнасць, акцэнтаваць увагу на неабходных радках.

**Літаратура**

1 Жураўлёва, С. І. Стылістыка беларускай мовы ў табліцах і схемах: даведнік / С. І. Жураўлёва. – Мазыр: МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2011. – 101 с.

2 Куляшоў, А. Збор твораў: у 5 т. / А. Куляшоў. – Т. 1. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. – 531 с.

3 Куляшоў, А. Збор твораў: у 5 т. / А. Куляшоў. – Т.2. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1975. – 304 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ